пэўнай праблеме; б) праверыць, ці знаходзіцца кніга ў фондзе; в) пачаць працаваць над новай складанай тэмай; г) правесці даследаванне па дадзенай праблеме.

Праблемныя сітуацыі па тэме «Тэатр» на факультэце культуралогіі могуць быць наступныя.

— Раскажыце, у якой паслядоўнасці ідзе праца над п'есай, што рыхтуецца да пастаноўкі.

— Група гасцей з Англіі цікавіцца тэатральным жыццём сталіцы. Што Вы раскажаце? Які тэатр прапануеце наведаць?

— Паспрабуйце ўзяць інтэрв'ю ў вядомага акцёра.

— Уявіце сабе ў ролі артыста (артысткі) тэатра. Раскажыце аб сваім творчым шляху, аб любімых ролях.

— Уявіце сабе, што вы рэжысёр тэатра імя Я. Купалы. Раскажыце аб рабоце тэатра, яго тэатральнай трупе, апошніх спектаклях тэатра.

— Вы — акцёр Шэкспіраўскага тэатра. Раскажыце аб рабоце тэатра. Раскажыце, над чым Вы зараз працуеце, з якімі цяжкасцямі сутыкаецеся і інш.

Вышэйпрыведзеныя заданні пры навучанні гутарковай мове прымушаюць студэнтаў думаць, разважаць і знаходзіць аптымальнае рашэнне. Абавязкова пры складанні заданняў трэба ўлічваць спецыялізацыю студэнтаў.

Сістэматычнае выкарыстанне заданняў праблемнага характару з'яўляецца эфектыўным сродкам кіравання пазнавальнай дзейнасцю студэнтаў у навучальным працэсе; дапамагае стварыць ўмовы для творчага выкарыстання атрыманых ведаў, уменняў і навыкаў у новых абставінах. Заданні станоўча ўплываюць на развіццё інтэлектуальных уменняў (параўнанне, аналіз, вызначэнне галоўнага, абагульненне, канкрэтызацыя) і вучэбных уменняў (пастаноўка мэты, планаванне будучай дзейнасці, вызначэнне спосабаў дасягнення мэты, самакантроль): садзейнічаюць ўсведамленню студэнтамі прыкладнога характару атрыманых тэарэтычных ведаў, неабходнасці звязваць іх з прафесійнай дзейнасцю.



**Зубра А.С.,**
*прафесар*

# ФІЛАСОФІЯ РАЗВІЦЦЯ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ СТУДЭНТА УНІВЕРСІТЭТА КУЛЬТУРЫ

Развіццё здольнасцей студэнта заўседы цесна звязана з тымі сацыяльна-эканамічнымі ўмовамі, у якіх яно адбываецца, з сістэмай адукацыі. Сёння, абмяжоўваючыся простым узнаўленнем мінулага вопыту і даючы студэнтам «шматковыя» веды пад націскам інфармацыйнага буму, сістэма вышэйшай адукацыі перастала служыць творчай асновай для развіцця здольнасцей студэнта, яго самарэалізацыі і самасцвярджэння. Ва універсітэце многія студэнты вучацца абы-як, толькі б паспяваць на тройкі і атрымаць дыплом. А адбываецца гэта таму, што набыццё вышэйшай адукацыі большасць студэнтаў успрымаюць як механічны працэс, незалежна ад здольнасцей. Вынік такіх аблегчаных адносін да навучання - зніжэнне якасці вышэйшай адукацыі, марнаванне часу і сродкаў. Пры гэтым ва ўмовах эканамічнага крызісу ніхто не нясе адказнасці за гэта. «Кадры вырашаюць усё!» — той лозунг, які прадвызначыў знікненне адукацыі як феномена культуры, патрэбнасці асобы ў вышэйшай адукацыі як аднаго са спосабаў развіцця здольнасцей і ўдасканалення культуры асобы. Усё гэта не задавальняе сённяшняе грамадства.

Вышэйшая адукацыя, зарыентаваная на дасягненне вузкапрагматычнай мэты - падрыхтоўку спецыялістаў, прывяла да таго, што з ВНУ знік дух пошуку, смелага парывання. Ва універсітэт прыйшло жыццё, пазбаўленае яскравых фарбаў, якія робяць яго прывабным для студэнта. Агульная глабальная мэта, звязаная з падтрыманнем культа культуры, распалася на мноства дробных, прыватных мэт: атрымаць дыплом, заняць пасаду, прасунуцца па рабоце і інш..

З чаго трэба пачынаць, каб змяніць становішча? З пастаноўкі мэты, бо без мэты нельга паспяхова развіваць здольнасці студэнтаў. Гаворка ідзе аб неабходнасці змены

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стратэгічных глабальных мэт адукацыі, перамяшчэння акцэнту з ведаў спецыяліста на яго чалавечыя, асабістыя якасці. Ужо сёння трэба разумець наступнае: як цывілізацыя немагчыма без адукацыі, так і адукацыя немагчыма без культуры. Адсюль вынікае неабходнасць канцэпцыі мэты. Вядучая мэта -- фарміраванне культуры асобы студэнта, здольнай да самакіравання, самаадукацыі, самаўдасканалення ў працэсе ўсёй жыццядзейнасці.

Менавіта культура зможа вярнуць працэсу вышэйшай адукацыі яго сутнасць, а першапачатковы сэнс —самаадукацыя. Неабходна студэнта з аб'ектаператварыць у суб'ект адукацыі.

Для гэтага ёсць фундаментальныя асновы. Больш за сто год таму цікавую думку ў гэтых адносінах выказаў К.Д.Кавелін. Тады панавала думка, што ўчынкі людзей вызначаюць толькі знешнія абставіны, адначасова асоба як культурны дзеяч ігнаруецца. «Калі свету суджана быць абноўленым, то гэта можа здзейсніцца знутры нас», — адзначаў Кавелін. Ён лічыў, што толькі перабудова душы можа зрабіць больш дасканалымі і чалавека, і грамадства. Для гэтага недастаткова інфармаванасці, атрыманай звонку, аб разнастайнасці духоўных каштоўнасцей, маральных ведах папярэдніх пакаленняў. Неабходна, каб кожны студэнт меў магчымасць усвядоміць для сябе свае ідэалы, ажыццявіць уласны маральны выбар пасля напружанай унутранай духоўнай работы. Толькі ў гэтым выпадку духоўныя каштоўнасці грамадства стануць для яго асабіста значнымі. Тут мы маем на ўвазе не простае ўзнаўленне ведаў, а здабыванне іх уласнымі сіламі, сваёй напружанай разумовай працай. Акрамя гэтага, вялікае значэнне маюць эмацыянальна-каштоўнасныя адносіны да культурных дасягненняў. Таму культура ўяўляе сабой меру чалавечага ў чалавеку, характарыстыку развіцця чалавека як грамадскай істоты. Значыць, культура існуе ў пастаянным узаемадзеянні свайго знешняга выяўлення з самім чалавекам. Гэта ўзаемадзеянне заключаецца ў тым, што чалавек засвойвае створаную раней культуру, распрадмечвае яе, робячы тым самым умовай сваёй дзейнасці, і стварае культуру, стварае новую, апрадмечваючы свае веды, навыкі, уменні, каштоўнасці і здольнасці.

Цудоўна гэту думку выказаў паэт А.А.Фет у адным са сваіх вершаў:

Два мира властвуют от века,
Два равноправных бытия:
Один объемлет человека,
Другой душа и мысль моя.
И, как в росинке, чуть заметной,
Весь солнца лик ты узнаёшь,
Так слитно в глубине заветной
Всё мирозданье ты найдёшь.

Сапраўды, два светы: культура грамадства, грамадства ў цэлым, мікраасяроддзя (калектыў, сям'я, сябры, вуліца) — аб'ектыўны свет, і культура асобы, яе дзейнасць, самасвядомасць — суб'ектыўны свет. Свет, які акружае чалавека, адлюстроўваецца ў яго душы, у яго думках, як сонца ў малой расінцы. Але гэта расінка асаблівая. Яна і малая, і бясконца вялікая ў сваёй здольнасці адлюстроўваць, таму што яна можа ўмясціць увесь свет. У гэтых радках спалучаюцца паэтычны бляск і глыбіня роздуму аб лёсе чалавека.

Свет, які мы ствараем,— гэта ўнутраны, духоўны свет: свет думак, уяўленняў, пачуццяў, які адлюстроўвае аб'ектыўна існуючыя з'явы, працэсы ў пераўтвораным выглядзе, а не шляхам простага капіравання. Асоба становіцца стваральнікам духоўнага працэсу. Для студэнта — гэта вышэйшая мэта. Асабліва сказанае важна для прафесіянала з вышэйшай адукацыяй. Ствараць, развіваць сябе - значыць вырошчваць душу як магічны крышталь, як бяцэнную карону, якой увенчаны чалавек. У самага беднага чалавека ў даўніну, як кажуць, нічога за душой не было, але ў яго была душа — і быў чалавек.

Сёння відавочна новая важная функцыя вышэйшай адукацыі — пераканаць студэнта ў неабходнасці самаадукацыі, каб ён свабодна вызначыў свой шлях разумовай працы, меў магчымасць свабоднага выбару. Ён павінен быць адказным як за сваё жыццё, так і за свой духоўны свет, сваю дзейнасць і за жыццё прыроды. Задача адукацыі і заключаецца ў тым, каб "навесці" на сэнс, на тайну, на ісціну

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўзброіць студэнта такімі сродкамі задавальнення яго натуральнай цікавасці, якія б былі карыснымі і для грамадства, і для студэнта.

Лёс Рэспублікі Беларусь з цягам часу ўсё больш залежыць ад асабістых рэсурсаў чалавека. На першы план выходзіць асоба высокай культуры, яе каштоўныя арыентацыі, узровень інтэлекту, маральнасці. Таму і ўзрастае роля вышэйшай адукацыі. Менавіта ў сістэме вышэйшай адукацыі пракладае сабе дарогу глабальная тэндэнцыя руху культуры да цэласнасці чалавецтва. Homo sapiens — чалавек разумны — рухаецца да сваёй чалавечнасці і разумнасці. І ў стварэнні гэтай цэласнасці(асобы, культуры, цывілізацыі) важнейшую ролю адыгрывае вышэйшая адукацыя, якая разумеецца не толькі і не столькі як навучанне, а як усведамленне сябе і свету, апусканне ў культуру, удасканаленне інтэлекту, духоўнага свету, акультурванне пачуццяў, змяненне ўнутранага свету студэнта па законах гармоніі і прыгажосці. Натуральна, фарміраванне культуры асобы студэнта як складанага цэласнага-асобаснага ўтварэння, як аб'екта і суб'екта развіцця здольнасцей патрабуе вывучэння і даследавання культуры асобы як сістэмы (гл. схему). Фарміраванне культуры асобы студэнта ў якасці вядучай мэты універсітэта культуры прадвызначае карэнны перагляд уяўлення аб каштоўнасці культуры ў грамадстве, аб месце культурных духоўных каштоўнасцей. Гаворка ідзе аб змене светапоглядных пазіцый, аб кардынальнай змене зместу і тэхналогіі вышэйшай адукацыі. Адукацыя, што разумеецца як пашырэнне магчымасцей развіцця асобы, дапамагае ажыццяўляць самы цяжкі выбар - выбар быць Асобай.

Здольнасці — гэта асоба ў яе прадуктыўнасці. Да таго часу, пакуль студэнт не пачаў выконваць пэўны від дзейнасці, у яго існуюць патэнцыяльныя здольнасці. Як толькі ён пачынае сур'ёзна займацца разумовай дзейнасцю, яго патэнцыяльныя здольнасці становяцца актуальнымі. Яны выяўляюцца і фарміруюцца ў пэўных умовах вучэбнай дзейнасці.

Філасофія развіцця здольнасцей студэнта універсітэта культуры прадугледжвае неабходнасць будаваць вучэбны працэсс ад студэнта, ад яго агульных і прыватных здольнасцей. Вядома, што кожны чалавек нараджаецца з агульнай патрэбнасцю ў самаактуалізацыі, самарэалізацыі, самасцвярджэнні, з патэнцыяльнымі агульнымі здольнасцямі да агульначалавечых відаў дзейнасці: да мыслення, зносін, творчай дзейнасці. Гэтыя здольнасці былі адкрышталізаваны і замацаваны прыродай у гэнатыпе чалавека на працягу мільёна гадоў яго грамадскага развіцця. Пры спрыяльных умовах гэтыя здольнасці перарастаюць ва універсальныя. Сёння навука ў якасці гэтых здольнасцей вылучае: па-першае, здольнасць да канцэптуальнага мыслення, гэта значыць цэласнага бачання свету праз прызму самарэалізацыі, што дазваляе студэнту рашаць такую праблемную сітуацыю, у якой ён аказваецца, таму што цэласная карціна свету ў адрозненне ад фрагментарнай менш супярэчлівая.

Па-другое, гэта здольнасць жыць сярод людзей, мець з імі зносіны, суперажываць агульнаму шчасцю, адчуваць сябе часткаю агульнага цэлага. Па-трэцяе, гэта здольнасць увасабляць сваё цэласнае ўяўленне аб свеце і аб агульным шчасці ў асэнсаванай для сябе творчай дзейнасці. Студэнт выступае тут як фокус культуры ў стадыі яе развіцця. У гэтым выпадку адукацыя набывае чалавекатворчы характар і рэальна стварае ўмовы для развіцця здольнасцей, самарэалізацыі і самасцвярджэння студэнта.

Ва ўмовах універсітэта культуры трэба вылучыць асаблівы від здольнасцей — творчыя здольнасці. Яны разглядаюцца як дзейнасць студэнта па стварэнні новых духоўных прадуктаў, якія маюць сацыяльную каштоўнасць. Але творчасць — гэта і сам працэс стварэння духоўных каштоўнасцей, дзе студэнт рэалізуе свае патэнцыяльныя здольнасці і дзе ён сам развіваецца як асоба. Патэнцыяльныя творчыя здольнасці, якія маюць задаткі, развіваюцца не непасрэдна. З задаткаў добрага слыху ў працэсе развіцця асобы ў залежнасці ад умоў жыцця могуць сфарміравацца і музычныя здольнасці, і здольнасці радыёакустыка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Культура асобы як сістэма



**Як паказваюць нашыя даследаванні,** здольнасці найбольш паспяхова развіваюцца, калі студэнт любіць сваю прафесію, імкнецца авалодаць ёю. Таму вопытны выкладчык павінен зацікавіць студэнта, выхаваць у яго схільнасць і любоў да абранай прафесіі. У гэтым выпадку студэнт не проста ўключаны ў навучальны працэс. Ён унутрана адданы сваёй справе, працэсу пазнання, разглядае абраную прафесію ў якасці свайго прызвання, бескарысліва і цалкам пагружаецца ў яе асваенне. Гэта працэс, у якім творчае «Я» рэалізуе сябе. У творчым студэнце своеасабліва спалучаюцца якасці сталай, незалежнай асобы з дзіцячай прастадушнасцю і свежай цікавасцю да ўсяго новага. Асноўнае імкненне творчай асобы студэнта — імкненне да самаактуалізацыі, самарэалізацыі і самасцвярджэння сваіх здольнасцей і адначасова сцвярджэння тых культурных каштоўнасцей, якія студэнт падзяляе. Творчы студэнт арыентуецца на такія агульначалавечыя культурныя каштоўнасці, як дабро, справядлівасць, гонар, ісціна, прыгажосць, дасканаласць. Самарэалізацыя для яго — гэта праца розуму, душы дзеля таго, каб дасягнуць дасканаласці ў тым, што студэнт прызваны рабіць. Ён імкнецца да таго, каб быць прафесіяналам у сваёй справе і пастаянна заклапочаны сваім ростам, развіццём і удасканаленнем. Для творчай асобы студэнта найбольш важныя наступныя якасці: імкненне да самарэалізацыі і самасцвярджэння, захапленне працэсам навучання, намаганні да аўтарытэтаў і адначасова самастойнасць і незалежнасць у разважаннях, упэўненасць у сваіх сілах, ініцыятыўнасць і гібкасць, успрымальнасць і адкрытасць у адносінах да новага.

**У выніку** будзе адбывацца перавод тэхналогіі навучання ў стан сістэмы, якая саморазвіваецца. У ёй рухаючай сілай з'яўляецца педагогіка супрацоўніцтва, а вышэйшым прыярытэтам — патрэбнасць студэнта ў пазнанні агульначалавечай культуры. Што гэта дае? Перш за ўсё разуменне таго, як удасканальваць змест, тэхналогію навучання і методыку выкладання ў адносінах канкрэтнай студэнцкай аўдыторыі, каб не губляць час і сілы марна.

Самай сур'ёзнай і пакуль што не аналізуемай праблемай з'яўляецца ўменне студэнта вучыцца ў вышэйшай школе. Культура асобы, прафесіяналізм патрабуюць пастаяннага самаўдасканалення. А каб студэнт займаўся самаўдасканаленнем ва універсітэце, а затым і пасля яго заканчэння, яму неабходна атрымаць пэўныя веды, навыкі, уменні і прывычкі саманавучання, самаадукацыі, самакіравання. Даследаванні вучэбнага працэсу як дзейнасці пацвердзілі неабходнасць вылучэння ва універсітэце асаблівага зместу адукацыі — метаведаў — ведаў аб саміх ведах — уменні вучыцца. Адсюль вынікае, што патрэбен інтэграваны вучэбны прадмет «Культура разумовай працы». Мы падрыхтавалі па гэтым прадмеце праграму, падручнік, метадычныя рэкамендацыі. Ёсць магчымасці падрыхтаваць групу выкладчыкаў універсітэта, якія маглі б весці заняткі са студэнтамі. Падводзячы вынікі сказанага, звяртаем увагу на наступнае.

1. Паспяховае развіццё здольнасцей студэнта магчыма пры ўсебаковым усведамленні таго, што ва універсітэце культуры працуюць канкрэтныя асобы — выкладчыкі, навучаюцца канкрэтныя асобы — студэнты. Вышэйшая школа заўсёды ўяўляла і ўяўляе ўзаемадзеянне гэтых асоб паміж сабою. Працэс развіцця здольнасцей студэнта дае поўную інфармацыю аб гэтым ім і выкладчыку.

2. Канкрэтнаму студэнту і канкрэтнаму выкладчыку выключна важна зразумець і прыняць агульную задачу — правільна бачыць рэальнасць і ў адпаведнасці з гэтым будаваць пазнавальную дзейнасць і сумесна вырашаць, як ва ўмовах вялікай колькасці інфармацыі вучыць лепш, але за меншы час.

3. Сёння яўна недастаткова проста даследаванасці аб разнастайнасці духоўных каштоўнасцей, маральных уяўленнях папярэдніх пакаленняў. Неабходна самастойная разумовая дзейнасць студэнта, каб ён меў магчымасць уразумець для сябе ідэалы, ажыццявіць уласны маральны выбар, зрабіўшы ўнутраную духоўную працу, навучыцца выражаць адносіны да свету, да людзей, да сябе. Калі валявое, маральнае напружанне і інтэлектуальнае будзе прысутнічаць у працэ-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

се навучання і выхавання, то працэс фарміравання культуры асобы студэнта дасць станоўчыя вынікі. На гэтай аснове студэнт можа стварыць новае, развівацца як творчая асоба.

З выказванняў і анкет можна прывесці нямала прыкладаў аб цяжкасцях у вучобе, аб іх перадоленні, аб тым, як прыйшла вера ў сябе. Прывядзем толькі адно, але характэрнае выказванне.

Аляксандр: Першы курс мне даваўся з вялікімі цяжкасцямі. Даводзілася шмат працаваць. Ведамі не вызначаўся. А група, куды я быў залічаны, аказалася з высокім узроўнем ведаў. Мне было крыўдна і сорамна, што я шмат чаго не ведаю і не разумею. Паверце, я хачу вучыцца, і я буду вучыцца. Два гады для мяне не прайшлі дарэмна. Гэта так цудоўна! Спрабуеш разабрацца ў сабе, у здольнасцях свайго мозгу. Здаецца, усё гэта адчуваў раней, але, вывучаючы навукі, пачынаеш па-новаму ацэньваць свае погляды, паводзіны... У маёй свядомасці адбыўся выбух. Я ўбачыў шмат прыгожага там, дзе раней бачыў толькі шэрае і незразумелае. Я глянуў на свет па-новаму. Адчуваю, што змяніліся мае адносіны да самога сябе і людзей. Стаў больш думаць, лепш гаварыць, менш рабіць памылак, а гэта так важна ў жыцці. Я ведаю, што мне яшчэ шмат трэба працаваць над сабой. Але галоўнае тое, што я ўжо бачу сваю мэту, таму што без яе жыць нельга. Я лепш стаў бачыць, што мне трэба і як трэба рабіць. Цяпер я цвёрда веру, што выбраў правільны шлях.

Задача выкладчыка — паказаць сваім асабістым прыкладам, як трэба і важна публічна разважаць, натхняць, захапляць. Адзін з бакоў майстэрства выкладчыка заключаецца ва ўменні адкрываць перад студэнтам тыя сферы духу, дзе ён можа дасягнуць вышыні, праявіць сябе, быць своеасаблівым прыкладам навуковага мыслення — знаёміць студэнтаў з самымі апошнімі дадзенымі навукі, быць мастацкі адукаваным і маральным чалавекам. Таму сутнасць працы выкладчыка заключаецца не ў тым, каб «прачытаць матэрыял» студэнтам, а «навучыць чытаць матэрыял» іх, узброіць прыёмамі пазнавальнай дзейнасці, сістэмай арыентацыі ў вывучаемым курсе.

Іваноў М.В.,
*дацэнт*
**Ровіна Р.А.,**
*дацэнт*
**Касап В.А.,**
*дацэнт*

## РАЗВІЦЦЁ ТВОРЧЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ СТУДЭНТАЎ ПРЫ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДЫПЛОМНЫХ РАБОТ

Развіццё творчых здольнасцей асобы ўвогуле і студэнтаў у прыватнасці адносяць да адной са складаных псіхолага-педагагічных праблем. У літаратуры адсутнічае адзіны погляд на паняцце «творчасць». Яго разглядаюць, у прыватнасці, як сінтэз якасцей і асаблівасцей асобы; дзейнасць, у выніку якой ствараецца нешта новае. Нявызначанасць паняцця дрэнна адбіваецца на правядзенні канкрэтных даследаванняў.

Працэс творчага супрацоўніцтва студэнта, які працуе з выкладчыкам, носіць ярка выражаны псіхолага-педагагічны характар. Аднак тут прысутнічаюць і арганізацыйныя аспекты, ад якіх залежыць матывацыя выбару напісання менавіта дыплома. Асабліва гэта адносіцца да тых гуманітарных ВНУ, дзе дыпломныя работы пішуць толькі добра паспяваючыя студэнты.

Арганізацыя НДР студэнтаў у розных ВНУ мае сваю спецыфіку. У некаторых з іх аб навуковай тэматыцы даследаванняў кафедраў паведамляюць студэнтам на першым курсе. Кожнаму студэнту даецца поўная свабода выбару тэмы ў адпаведнасці з яго інтарэсамі. Пры жорсткай сістэме замацавання студэнтаў за канкрэтным выкладчыкам студэнты павінны пісаць дыпломныя работы ў адпаведнасці з напрамкамі навуковых інтарэсаў кіраўнікоў. Гэта зніжае матывацыйна-творчую актыўнасць студэнтаў.

Творчае супрацоўніцтва студэнта і кіраўніка залежыць ад розных фактараў, асноўныя з якіх адлюстраваны ў схеме.




На схеме паказана, што і кіраўнік, і студэнт маюць: а) мноства; б) дастаткова ідэнтычных